***Свірыдзенка В. І.**, дацэнт кафедры беларускага і рускага мовазнаўства Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, кандыдат педагагічных навук, дацэнт*

# Беларуская мова. III клас

## Установы адукацыі з рускай мовай навучання

### Раздзелы «Паўтарэнне», «Тэкст», «Сказ»

**Урок па тэме «Паўтарэнне»**

***Мэты:*** актуалізаваць веды трэцякласнікаў пра падоўжаныя зычныя гукі, іх абазначэнне на пісьме літарамі, пра правапіс апострафа і раздзяляльнага ***ь*** у словах; адпрацоўваць уменні перадачы на пісьме і пераносу слоў з падоўжанымі зычнымі, з апострафам і раздзяляльным ***ь***; выпрацоўваць вымаўленчыя навыкі, узбагачаць слоўнікавы запас навучэнцаў устойлівымі выслоўямі, народнымі прыкметамі; развіваць назіральнасць, эрудыцыю; выхоўваць цікавасць да вывучэння мовы.

***Абсталяванне:*** вучэбны дапаможнік, ч. 1, с. 15–18 (В. І. Свірыдзенка, 2023); малюнкі семя, сям'і, дзяўчынкі, якая палівае кветкі, дзяўчынкі, якая поле градку, карткі са словамі.

**І. Праверка дамашняга задання.**

— Прачытайце верш з практыкавання 24. Як выглядае сарока? Чаму яе называюць белабокай? Якія якасці сарокі прыгадвае аўтар у вершы? *(Цікаўнасць, уменне гучна крычаць, стракатаць).* Дзе можна ўбачыць гэтую птушку? Назавіце ў вершы словы з пропускамі літар. Якія гукі вымаўляюцца на месцы пропускаў? Якія літары вы ўставілі ў словы? Чаму? Якія літары пішуцца пасля ***ц, дз***? Якую літару вы падкрэслілі ў слове *сарока* (*даўжэзны, чуе, вёрст*)? Які гук яна абазначае? Ці ведаеце вы значэнне слова *вярста* (*вёрст*)? *(Мера даўжыні, крыху большая за адзін кіламетр, якой карысталіся ў старажытныя часы.)*

**ІІ. Паўтарэнне вывучанага.**

**1. Работа па вучэбным дапаможніку.**

— Адгарніце вучэбны дапаможнік на с. 15. Разгледзьце схему і прачытайце словы. Якія зычныя гукі могуць падаўжацца паміж галоснымі? Як абазначаюцца падоўжаныя зычныя на пісьме? Прывядзіце ўласныя прыклады слоў з падоўжанымі зычнымі.

***Практыкаванне 25.***

— Прачытайце першую пару слоў. У якім слове чуецца падоўжаны гук [л']? Паміж якімі гукамі вымаўляецца падоўжаны гук [л']? Колькі літар трэба ўставіць у слова *наваколле*? Які гук вымаўляецца на канцы слова *навокал*? Як абазначым гэты гук на пісьме? Запішыце першую пару слоў, устаўляючы патрэбныя літары. (Аналагічная праца арганізуецца з астатнімі словамі.)

***Практыкаванне 26.***

— Прачытайце прыказку. Што яна абазначае? *(Калі дакладна сфармулюеш пытанне, якое цябе цікавіць, зможаш атрымаць вычарпальны (поўны) адказ.)* Спішыце, устаўляючы патрэбныя літары. (Пасля запісу вучні тлумачаць правапіс устаўленых літар.) Абазначце націск у словах. (Самастойнае выкананне задання.) У якім слове націск падае на першы (другі, трэці) склад? Падкрэсліце ў словах літары, якія абазначаюць зацвярдзелыя зычныя і галосныя пасля іх. (Самастойнае выкананне задання. Узаемаправерка.)

**2. Работа па заданні на дошцы.**

На дошцы прымацаваны малюнкі і карткі са словамі (мал. 1).




*Малюнак 1*

— Разгледзьце малюнкі. Хто на іх намаляваны? Прачытайце словы, размешчаныя пад малюнкамі. Якім словам можна падпісаць першы (другі) малюнак? *(Сям'я, палью.)* (Пасля адказаў вучняў карткі са словамі *семя, палю* прыбіраюцца з дошкі.) Назавіце па парадку гукі ў слове *сям'я (палью)*. Які знак паказвае, што ў слове *сям'я (палью)* паміж зычным і галосным вымаўляецца гук [й]? *(Апостраф / раздзяляльны **ь**.)* Калі ў словах пішацца апостраф, а калі раздзяляльны мяккі знак? (Вучні даюць адказы на пытанне.) Адгарніце вучэбны дапаможнік на с. 16. Разгледзьце схему і праверце правільнасць і паўнату вашых адказаў.

**3. Работа па вучэбным дапаможніку.**

***Практыкаванне 27.***

— Прачытайце словы. Які гук вымаўляецца ў іх на месцы пропускаў паміж зычным і галосным? Якую літару або знак трэба ўставіць у словы? (Вучні па чарзе вымаўляюць кожнае слова, называюць гук у слове на месцы пропуску, тлумачаць, якая літара або знак прапушчаны.) Па якой прымеце гэтыя словы падзелены на дзве групы? Самастойна запішыце словы, дапісваючы ў іх патрэбную літару або знак.

— Успомніце і раскажыце, як пераносяцца з радка на радок словы з апострафам і мяккім знакам. (Выслухоўваюцца адказы вучняў. Кожнаму раду даецца заданне самастойна падзяліць для пераносу ўсімі магчымымі спосабамі слова *аб'ява*, *бар'ер* або *вальера*. Тры вучні выконваюць заданне на дошцы. Праводзіцца франтальная праверка выканання задання.)

***Практыкаванне 28.***

— Прачытайце вершаваныя радкі. Што абазначае выраз *пальчыкі абліжаш*? *(Вельмі смачны.)* Прачытайце спалучэнні слоў, запісаныя на дошцы: *за вушы не адцягнеш*, *у роце растае*, *пальца ў рот не кладзі, язык праглынеш*.

— Якія з іх блізкія па значэнні да выразу *пальчыкі абліжаш*?

Спішыце вершаваныя радкі, устаўляючы ў словы патрэбныя літары або знак. (Адзін з вучняў працуе каля дошкі, астатнія — у сшытках. Вучань каля дошкі каменціруе правапіс слоў падчас запісу.)

***Практыкаванне 29.***

— Прачытайце верш. Якія стравы з грыбоў падабаюцца вам? Хто з вас любіць іх збіраць? Якія грыбы вы любіце збіраць? З кім вы ходзіце ў грыбы?

— Спішыце. Устаўце ў словы патрэбныя літары. (Адзін з вучняў працуе каля дошкі, астатнія — у сшытках. Вучань каля дошкі каменціруе правапіс слоў падчас запісу.)

***Практыкаванне 30.***

— Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі з правага слупка. Калі так гавораць? *(У навальніцу.)* Спішыце. Устаўце ў словы патрэбную літару або знак. (Самастойнае выкананне задання вучнямі. Узаемаправерка напісанага.)

**4. Калектыўная праца па заданні на дошцы.**

— Назва якога населенага пункта Беларусі зашыфравана ў рэбусе (мал. 2)?




*Малюнак 2*

— Што вы ведаеце пра Заслаўе? Чым знакаміты гэты горад Беларусі? (Выслухоўваюцца адказы вучняў. Настаўнік можа дадаткова паведаміць наступную інфармацыю: «Заслаўе знакамітае сваёй багатай гісторыяй і мноствам старажытных месцаў. Гісторыя горада пачалася ў XII стагоддзі. Паводле падання, кіеўскі князь Уладзімір Святаславіч пасяліў у полацкай зямлі сваю непакорлівую жонку Рагнеду і сына Ізяслава, у гонар якога і быў названы горад. Трагічны лёс гордай Рагнеды і адважнага Ізяслава захаваны ў выглядзе бронзавай скульптуры, што размешчана ў новай частцы горада».)

— Назавіце паслядоўна гукі ў слове *Заслаўе*. Колькі гукаў і колькі літар у ім? Чаму колькасць гукаў і літар не супадае? *(Пасля літары **ў** літара **е** абазначае два гукі* **[й], [э]**.*)* Давайце запішам назву горада ў сшытку. Папярэдне ўспомніце і скажыце, ці трэба пісаць апостраф пасля літары **ў**? З якой літары трэба запісаць слова *Заслаўе*?

**5. Работа па вучэбным дапаможніку.**

***Практыкаванне 31.***

— Прачытайце. Словы якой мовы вы прачыталі? Зараз пагуляем у перакладчыкаў: перакладзём гэтыя словы на беларускую мову і запішам іх. (Вучні па чарзе перакладаюць словы, запісваюць іх на дошцы і ў сшытках, падзяляючы для пераносу.) Якое слова мы не змаглі падзяліць для пераносу? *(Ілья.)* Вусна складзіце сказ з гэтым словам. (Заслухоўваюцца адказы вучняў.)

***Практыкаванне 32.***

— Прачытайце народную прыкмету і прыказку. Якія прыкметы дажджлівага лета вы ведаеце? (Калі вучні не прыгадваюць такіх прыкмет, настаўнік называе іх сам: «З бярозы цячэ шмат соку — да дажджлівага лета. Частыя туманы ў сакавіку — да дажджлівага лета. Калі бяроза выкінула лісце раней за вольху — лета чакаецца гарачае і сонечнае, а калі ж раней распусцілася вольха — да халоднага і дажджлівага лета».)

— Запомніце народную прыкмету з практыкавання. Растлумачце правапіс выдзеленых літар у словах. Запішыце сказ па памяці. Падкрэсліце слова з раздзяляльным мяккім знакам. (Пасля выканання задання праводзіцца самаправерка напісанага.)

***Практыкаванне 33.***

На дошцы робіцца запіс: *з вераб'ёў нос*.

— Прачытайце вобразны выраз, запісаны на дошцы. Як вы думаеце, так гавораць, калі чагосьці вельмі мала ці калі штосьці вельмі маленькае? (Вучні выказваюць свае меркаванні, потым правяраюць іх правільнасць, звяртаючыся да практыкавання ў вучэбным дапаможніку. Даецца заданне перабудаваць сказ, прапанаваны ў практыкаванні, выкарыстаўшы адпаведны фразеалагізм.)

**III. Дамашняе заданне.**

Практыкаванне 34.

**IV. Вынік урока.**

— Калі падаўжаюцца зычныя гукі? Прывядзіце прыклады слоў з падоўжанымі зычнымі. Як абазначаюцца падоўжаныя зычныя на пісьме? Калі ў словах пішуцца апостраф і раздзяляльны мяккі знак? Я буду называць вам словы, а вы пакажаце сігнальнымі карткамі, які раздзяляльны знак пішацца ў іх. (Настаўнік чытае словы: *пер'е, вальер, з'явіўся, льецца, вераб'і, парцьеры, кар'ера, Афанасьеў*.)

**Урок па тэме «План тэксту»**

***Мэты:*** пазнаёміць вучняў з роляй плана тэксту; фарміраваць уменні складаць план тэксту

з апавядальных і пытальных сказаў; правесці прапедэўтычныя назіранні за асаблівасцямі цытатнага плана; развіваць мысленне, вуснае звязнае маўленне; выхоўваць міралюбнасць.

***Абсталяванне:*** вучэбны дапаможнік, ч. 1, с. 29–33 (В. І. Свірыдзенка, 2023); аўдыязапіс мелодыі да песні «Лясная песня» (сл. А. Русака, муз. У. Алоўнікава), мелодыі і самой песні «Не пагаснуць зоркі ў небе» (сл. Янкі Купалы, муз. М. Янчука); карткі з планам тэксту.

**І. Праверка дамашняга задання.**

— Прачытайце тэкст. Які загаловак вы яму далі? На што ўказвае загаловак: на тэму ці на асноўную думку? (Заслухоўваюцца адказы розных вучняў, у кожным асобным выпадку высвятляецца, на што ўказвае падабраны загаловак.)

— З якім слоўнікавым словам мы пазнаёміліся на мінулым уроку? *(Восеньскі.)* Знайдзіце ў запісаным тэксце слова, блізкае па значэнні да слоўнікавага. *(Асенні.)* Прачытайце сказ, у якім сустрэлася гэта слова. Перабудуйце сказ: замяніце ў ім слова *асенні* на слоўнікавае слова. Які сказ у вас атрымаўся? *(Гарыць-палае восеньскі лес.)*

**ІІ. Вывучэнне новага матэрыялу.**

***Практыкаванне 50.***

— Прачытайце тэкст. (Пасля чытання арганізоўваецца гутарка па змесце.) Паслухайце мелодыі песень і скажыце, якая з іх падыходзіць для песні аб міры. Свой адказ абгрунтуйце. (Гучаць аўдыязапісы мелодый «Лясная песня», «Не пагаснуць зоркі ў небе».)

***Практыкаванне 51.***

— Разгледзьце малюнкі. Знайдзіце і зачытайце частку тэксту, якая адпавядае першаму малюнку. Якую назву можна даць ёй? (*1. Дзяўчынка іграла на раялі.* Аналагічна суадносяцца з малюнкамі астатнія часткі тэксту. Даюцца назвы часткам: *2. Людзі падхапілі песню аб міры. 3. Птушкі ўсюды разнеслі песню аб міры.*) Запішыце загалоўкі кожнай часткі і пазначце іх лічбамі.

— Прачытайце інфармацыю, змешчаную ў рубрыцы на с. 30. Як можна назваць запіс, зроблены вамі ў сшытках? Што раскрывае план? Як вы разумееце выраз «перадае паслядоўнасць развіцця аўтарскай думкі»?

***Практыкаванне 52.***

— Прачытайце тэкст. (Пасля чытання арганізуецца гутарка па змесце. Удакладняецца значэнне спалучэння *прысядзібны ўчастак* (*участак зямлі, які знаходзіцца каля хаты*). Настаўнік запытваецца ў вучняў, якога слова не ведала дзяўчынка. Звяртаецца ўвага на значэнне слоў *разлузаць, разлушчыць*. Пасля падзелу тэксту на часткі складаецца план з пытальных сказаў: *1. Калі паспелі гарбузы? 2. Што зрабілі куры? 3. Пра што папрасіла ўнучка бабулю?*.) Дакажыце, што мы запісалі план.

— Параўнайце план тэксту «Любімая песня» і план тэксту «Распрані яе». Што іх аб'ядноўвае? (Раскрываюць змест тэксту, перадаюць паслядоўнасць развіцця аўтарскай думкі.) Чым яны адрозніваюцца? *(Адзін складзены са сцвярджэнняў, другі — з пытанняў.)* Прачытайце інфармацыю, змешчаную ў рубрыцы на с. 31 і адкажыце, як можна скласці план тэксту.

***Практыкаванне 53.***

На дошцы змяшчаецца цытатны план з практыкавання, адпаведная старонка вучэбнага дапаможніка пакуль не перагорнутая.

— Па плане можна здагадацца пра змест невядомага вам тэксту або ўспомніць змест вядомага тэксту. Давайце праверым гэта. Прачытайце план беларускай народнай казкі, складзены са слоў гэтай казкі. Ці здагадаліся вы, пра якую казку ідзе размова? *(«Як курачка пеўніка ратавала».)* Хто з вас чытаў гэту казку? Разгледзьце малюнкі да казкі, змешчаныя ў вучэбным дапаможніку на с. 32. Які малюнак адпавядае першай (другой, трэцяй, чацвёртай, пятай) частцы твора? Прыгадайце і раскажыце яе. (Пяць вучняў паслядоўна расказваюць па адной частцы тэксту.) Якія малюнкі падыходзяць да апошняй часткі казкі. Успомніце і раскажыце гэту частку з апорай на малюнкі. (Адзін вучань расказвае апошнюю частку казкі. У далейшым можна паслухаць 1–2 вучняў, якія раскажуць казку поўнасцю.)

На кожную парту раздаецца картка з назвай і планам тэксту з дамашняга практыкавання. Вучні чытаюць самі сабе.

— Як вы думаеце, пра што будзе ісці размова ў тэксце «Запаслівая гаспадыня»? (Вучні выказваюць свае меркаванні, потым чытаюць тэкст з дамашняга практыкавання і правяраюць свае здагадкі.)

**ІІІ. Дамашняе заданне.**

Практыкаванне 54.

**IV. Вынік урока.**

— Што раскрывае план тэксту? Аб чым можна здагадацца з апорай на план? Пра якія спосабы складання плана вы даведаліся на ўроку?

## Урок па тэме «Прыметы сказа»

***Мэты:*** узнавіць веды навучэнцаў пра асноўныя прыметы сказа, пра знакі прыпынку ў канцы сказа; развіваць інтанацыйныя навыкі, граматычны лад маўлення, лагічнае мысленне, вуснае звязнае маўленне навучэнцаў; выхоўваць здаровы лад жыцця.

***Абсталяванне:*** вучэбны дапаможнік, ч. 1, с. 41–45 (В. І. Свірыдзенка, 2023); сшытак на друкаванай аснове (Свірыдзенка, В. І. Беларуская мова : 3-ці кл. : рабочы сшытак : дапам. для вучняў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / В. І. Свірыдзенка. — Мінск : Аверсэв, 2021. — 96 с.).

**І. Праверка дамашняга задання.**

— Як называецца тэкст, план якога вы складалі дома? Якую добрую справу зрабілі галоўныя героі апавядання? Як гэта характарызуе іх? Колькі частак вы вылучылі ў тэксце? Прачытайце план, які ў вас атрымаўся.

— Хто з вас падрыхтаваў паведамленне пра прафесію журналіста? (Заслухоўваюцца паведамленні падрыхтаваных вучняў. Настаўнік можа дапоўніць адказы дзяцей: «Журналісты займаюцца пошукам інфармацыі пра важныя падзеі, якія адбываюцца ў свеце. Людзі гэтай прафесіі расказваюць пра розныя падзеі вусна і пісьмова (у газетах, часопісах, на тэлебачанні і радыё). Добры журналіст павінен многа ведаць, добра гаварыць і пісаць. У яго павінна быць добрая памяць, каб дакладна запамінаць тое, пра што яму расказваюць. Журналісты часта бяруць інтэрв'ю ў людзей, якія дабіліся значных поспехаў у сваёй дзейнасці. Добры журналіст, задаўшы пытанне, уважліва выслухоўвае адказ суразмоўцы, не перапыняе яго, дае магчымасць чалавеку выказацца».)

**II. Абагульненне.**

**Праца ў парах «настаўнік — вучань».**

Адзін вучань адказвае на пытанні на с. 41, другі кантралюе правільнасць адказаў. Вучань, які выконвае ў пары ролю настаўніка, фіксуе знакам «+» на картцы правільныя адказ, а ў вуснай форме пры неабходнасці выпраўляе недакладнасці ў адказах напарніка. Правільнасць адказу на пытанне, якое выклікала цяжкасці, і дакладнасць выпраўлення правяраецца двума вучнямі па вучэбным дапаможніку. Пасля таго як будуць атрыманы адказы на ўсе пытанні, кожная пара вучняў падымае сігнальную картку. Настаўнік звяртаецца да ўсяго класа і запытваецца ў дзяцей:

— Пры адказе на якое пытанне ўзніклі цяжкасці? (Агучваюцца па чарзе пытанні, якія выклікалі цяжкасці.) Да якой тэмы трэба звярнуцца яшчэ раз, каб правільна адказаць на гэтае пытанне (пытанні)? Дзе ў вучэбным дапаможніку знаходзіцца адказ на пытанне? (Можна прапанаваць варыянт працы, калі вучні ў парах абмяркоўваюць адказы на пытанні, а пасля прагаворваюць па чарзе ўсе адказы ўслых. Пры ўзнікненні цяжкасцей настаўнік просіць звярнуцца да адпаведных старонак вучэбнага дапаможніка.)

— Вы толькі што ўзнавілі свае веды пра тэкст. Зараз праверым, як вы ўмееце прымяняць іх на практыцы. Уявіце сябе казачнікамі. Вам трэба скласці казку, загалоўкам якой будзе прыказка *Кошка мышцы не таварыш*. Пра каго можна так сказаць? *(Можна сказаць пра ката і мышэй: кот палюе на мышэй і яны не могуць быць сябрамі. Можна сказаць пра людзей, якія маюць розныя інтарэсы; пры гэтым дзеянні аднаго чалавека могуць ускладняць жыццё другому.)* На што будзе ўказваць такі загаловак казкі: на тэму ці на асноўную думку тэксту? Дакажыце сваю думку. *(Загаловак указвае на асноўную думку казкі, таму што ў ім заключаецца вывад.)* Давайце складзём план казкі, дзейнымі асобамі якой будуць кошка і мышка. Як вы думаеце, з чаго магла б пачынацца такая казка? *(Напрыклад, з таго, што жылі ў адной хаце, па суседстве кошка і мышка.)* Што яны вырашылі аднойчы зрабіць? *(Напрыклад, вырашылі яны разам нарыхтоўваць запасы на зіму і складваць іх у адну кладоўку.)* Што выйшла з гэтай задумы? *(Напрыклад, кошка або мышка з'елі агульныя запасы.)* Чым усё скончылася? *(Напрыклад, кошка пакрыўдзілася, з таго часу яна палюе на мышку.)*

Прыкладны план казкі:

1. Добрыя суседкі.
2. Агульная кладоўка.
3. Нечаканы падман.
4. Непрымірымыя ворагі.

Настаўнік прапануе вучням па жаданні скласці да наступнага ўрока ўласную казку па прапанаваным плане і падрыхтавацца расказаць яе аднакласнікам.

**III. Вывучэнне новага матэрыялу.**

**1. Паведамленне тэмы і пастаноўка мэты ўрока.**

— Успомніце, з чаго складаецца тэкст. Мы пачынаем вывучаць тэму «Сказ». Сёння на ўроку прыгадаем вядомыя нам прыметы сказа.

**2. Работа па вучэбным дапаможніку.**

***Практыкаванне 66.***

— Прачытайце тэкст. Вызначыце межы сказаў. Падлічыце, колькі сказаў у тэксце. (Вучні працуюць у парах. Пасля выканання задання кожная пара падымае сігнальную картку з лічбай, якая ўказвае колькасць сказаў.) Выразна прачытайце першы сказ (другі і г. д.). (Вучні па чарзе чытаюць сказы з паніжэннем голасу ў канцы сказа.) Што выражаецца ў кожным сказе? *(Закончаная думка.)* Перачытайце сказ, у якім перадаецца асноўная думка тэксту. Запішыце гэты сказ. Як трэба правільна аформіць яго на пісьме?

— Прачытайце інфармацыю, змешчаную ў рубрыцы на с. 42, і адкажыце, што такое сказ.

***Практыкаванне 67.***

— Прачытайце. Знайдзіце сярод прапанаваных спалучэнняў і груп слоў сказы. Па якіх прыметах вы вызначылі сказы? *(Выражаюць закончаную думку, першае слова пішацца з вялікай літары, у канцы стаіць кропка, пытальнік або клічнік.)* Выпішыце сказы. Раскажыце, якія правілы работы за камп'ютарам вы ведаеце. (Заслухоўваюцца выказванні некалькіх вучняў. Настаўнік можа дапоўніць адказы дзяцей: 1) адлегласць ад вачэй да манітора не менш чым даўжыня выцягнутай рукі; 2) працягласць працы за камп'ютарам — не больш за 15 хвілін на дзень; 3) абавязкова неабходна выконваць зрокавую гімнастыку ў перапынках паміж працай за камп'ютарам.) Ці заўсёды вы выконваеце гэтыя правілы? Чаму небяспечна парушаць іх? Прачытайце спалучэнні слоў, якія вы не выпісалі з практыкавання. Што трэба зрабіць, каб ператварыць іх у сказы? Вусна ўтварыце сказы.

***Развіццё маўлення.***

— Як вы лічыце, калі камп'ютар становіцца ворагам, а калі — сябрам вучня? Абмяркуйце апошняе пытанне ў парах і агучце свой адказ усяму класу. (Вучні ў парах абмяркоўваюць пастаўленае пытанне, потым адзін з іх дае адказ, выкарыстоўваючы

формулу: «Мы з Ігарам абмеркавалі гэтае пытанне і лічым, што...». Калі навучэнцы не змаглі прыйсці да агульнага меркавання, то выкарыстоўваецца другая формула: «Мы не змаглі прыйсці да агульнага меркавання. Я лічу, што..., а Ігар думае інакш».)

***Практыкаванне 68.***

— Знайдзіце сказы, у якіх дапушчаны сэнсавыя памылкі. (Адзін вучань чытае першы сказ, выпраўляе ў ім сэнсавую памылку. Сказ запісваецца на дошцы і ў сшытках. Аналагічная праца праводзіцца з трэцім і пятым сказамі.)

**IV. Замацаванне.**

**1. Работа па вучэбным дапаможніку.**

***Практыкаванне 69.***

— Прачытайце словы кожнага радка. Ці можна назваць іх сказамі? Чаму? Што трэба зрабіць, каб з дадзеных слоў утварыць сказы? (Пасля складання і запісу прыказак звяртаецца ўвага на значэнне слова *гнуткі* (*гібкі*) і на сэнс прыказак. Даюцца адказы на пытанні: якому дрэву лягчэй ўратавацца ад моцнага ветру, а якому чалавеку лягчэй знайсці выйсце ў складанай сітуацыі? Як зямля дзякуе людзям?)

***Развіццё камунікатыўных уменняў (практыкаванне 70).***

— Складзіце сказы па пачатку. Улічыце апісаную сітуацыю. Якую яшчэ запіску можна напісаць маме? *(Мама, я пайшла... у магазін (на занятку ў музычную секцыю, у кіно).)* Пра што вы запытваецеся ў мамы, калі яна тэлефануе вам пасля працы? *(Мама, калі ты прыйдзеш дадому?)* З якімі святамі вы віншуеце маму? Якімі словамі вы віншуеце маму з днём нараджэння (з 8 Сакавіка, з Днём маці)? Выразна вымавіце сказы, якія ў вас атрымаліся. (Звяртаецца ўвага на правільнасць інтанавання сказаў розных відаў.) Паспрабуйце скласці працяг размовы, пачатак якой апісваецца ў сітуацыі № 3. Разыграйце ў парах размову мамы і дзіцяці.

**2. Работа ў сшытку на друкаванай аснове. Заданне № 1, с. 12.**

Пры наяўнасці часу настаўнік можа прапанаваць вучням самастойна вызначыць межы сказаў у тэксце.

**V. Дамашняе заданне.**

Практыкаванне 71.

**VI. Вынік урока.**

— Што такое сказ? Што выражаецца ў сказе? Як сказы афармляюцца на пісьме? Прывядзіце прыклад сказа.

**Крыніцы ілюстрацый:** http://dou1-usolie.ru/wp-content/uploads/2016/09/image001.jpg; https://us.123rf.com/450wm/AlexBannykh/AlexBannykh1403/AlexBannykh140300094/27251333.jpg.


## ВНИМАНИЮ АВТОРОВ

**Напомннаем требования к прнсылаемым статьям.**

К рассмотрению принимаются только материалы, которые были присланы вместе с заполненной анкетой.

Фотографии к статье следует предоставлять в формате .png или .jpeg, пронумеровав. В тексте самой статьи следует расставить ссылки на соответствующий номер фотографии.

Все материалы подлежат проверке на плагиат.

Авторы не имеют права публиковать материалы, которые уже разместили в сети Интернет или отправили в другие издания!

**В случае предъявлення исков и претензий третьих лиц в отношенни нарушення авторских прав авторы будут нестн ответственность и сами выступать в судебном процессе.**